Г.М. Канцавая (Брэст)

# КАНСТРУКЦЫІ З РОДА-ВІДАВЫМІ АДНОСІНАМІ ПАМІЖ КАМПАНЕНТАМІ Ў МОВЕ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

Сярод многіх моваведаў (Клюева В. М., Палеўская М.Ф. і інш.) распаўсюджана думка, што словы, якія суадносяцца па семантыцы як від і род, не з’яўляюцца сінонімамі. Гэтую думку яшчэ раней выказаў А.Б. Шапіра, які адзначаў: «Не сінанімічныя словы, дзе адно абазначае радавое паняцце, а другое (другія) відавое (відавыя)». У цэлым згаджаючыся з пунктам погляду вучонага, мы разам з тым лічым, што словы, якія суадносяцца як род і від, можна разглядаць як сінонімы ў пэўных межах і ў пэўных адносінах. Такія канструкцыі *(трава-лебяда, ягада-суніца, краскі-васілёчкі)* маюць розную сэнсавую агульнасць: словы, якія разглядаюцца як род, уключаюць у свой змест побач з суаднесеным да яго словам і іншыя словы, якія ўключаны ў яго відавую градацыю. Тут мы назіраем дыялектычныя суадносіны агульнага і адзінкавага: радавое паняцце *трава* разглядаецца як агульнае, а відавое паняцце *лебяда* разглядаецца як адзінкавае. Паміж агульным і адзінкавым існуе дыялектычная супрацьлегласць: гэта суадносныя, але супрацьлеглыя паняцці. Адно не поўнасцю ўключае другое, а апошняе цалкам вычэрпваецца першым. У той жа час у шэрагу выпадкаў даныя суадносіны дапушчальна разглядаць з пункту погляду перасячэння сэнсавых мностваў абодвух складнікаў. Трэба разумець, што гэта не механічнае вычляненне часткі іх зместу, а глыбока дыялектычная аперацыя, дзякуючы якой мы рэалізуем філасофскае паняцце асаблівага, якое выражае рэальны прадмет як цэлае ў адзінстве і ў суадносінах яго супрацьлеглых элементаў, як пачатак, што аб’ядноўвае іх у рамках цэлага. У працэсе пазнання супрацьлегласці агульнага і адзінкавага здымаюцца, пераадольваюцца ў катэгорыі асаблівага, якая выражае агульнае ў яго рэальным, адзінкавым увасабленні (напрыклад, *ягады* – агульнае праз *суніцы, маліны*), а адзінкавае – у яго адзінстве з агульным (і *суніцы, і маліны* існуюць як ягады). Гэты прыём пры абавязковым

уліку абмежаваных магчымасцяў яго ўжывання можа быць выкарыстаны да падобнага тыпу канструкцый у той частцы, дзе кампаненты маюць у адносінах адзін да другога аднолькавыя значэнні, г. зн. з'яўляюцца сінонімамі.

Сярод спалучэнняў слоў, у якіх адзін кампанент абазначае відавое, а другі – радавое паняцце, можна вылучыць дзве тэматычныя групы: 1) канструкцыі, якія складаюць тэматычную групу «раслінны свет» і 2) канструкцыі, якія складаюць тэматычную групу «жывёльны свет».

Першую групу складаюць спалучэнні слоў, радавыя і відавыя кампаненты якіх абазначаюць адпаведна: а) дрэва ці масіў дрэў – яго канкрэтны від (*лес-бор, лясы-бары, лес-гай, лес-дуброва, явар-дзерава, клён-дзерава, асіна-дзераўцо, каліна-дзерава і інш.);* б) ягада – яе канкрэтны від *(ягадка-суніца, ягадка-смародзіна, калінка-ягадка, ягадкі-суніцы і інш.);* в) трава – яе канкрэтны від *(траушка-камыш, сон-трава, рута-травачка, траўка-лебяда, асака-трава, палын-трава, кукель-зеллечка, чабор-зелле, рута-зеллейка, палын-травушка і інш.);* г) кветкі – іх канкрэтны від *(краскі-васілёчкі, кветачкі-peралесачкі, кветачка-рожа і інш.).* У такіх спалучэннях слоў першым кампанентам можа быць як слова, якое абазначае радавое паняцце, так і слова, што абазначае відавое паняцце. Кампаненты часцей за ўсё ўжываюцца ў форме адзіночнага ліку. Радавыя і відавыя кампаненты, называючы прадметы, могуць быць нейтральнымі словамі *(трава, зелле, лес, краскі, дзерава)*, а могуць разам з назвай іх пры дапамозе суфіксаў *(-ачк-, -ейк-, -к-, -ц-, -ечк-, -ушк-)* надаваць канструкцыям эмацыянальна-экспрэсіўныя адценні *(травачка, зеллейка, ягадка, дзераўцо, траўка, зеллечка, травушка, кветачкі, васілёчкі, пералесачкі*). Як бачым з прыкладаў, канструкцыі набываюць ласкальнае адценне. Яно яшчэ больш узмацняецца, калі абодва кампаненты маюць суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі *(кветачкі-пералесачкі, красачкі-васілёчкі, калінка-ягадка).*

Другую групу складаюць спалучэнні слоў, радавыя і відавыя паняцці якіх абазначаюць адпаведна: а) рыба – яе канкрэтны від *(шчука-рыба, рыба-бялуга, рыбка-краснакрылка, рыба-вокунь, шчучка-рыбачка і інш.);* б) птушкі – іх

канкрэтны від *(пташкі-сакалы, пташкі-курапаткі, пташкі-верабейкі, салавейка-пташачка, салавейкі-пташкі, пташачкі-канарэечкі і інш.);* в) звер – яго канкрэтны від *(леў-звер).* У такіх канструкцыях слова, якое абазначае радавое паняцце, можа займаць і першую *(пташкі-сакалы)*, і другую пазіцыю *(шчука-рыба).* Як радавыя *(рыбачка, пташачка, рыбка)*, так і відавыя *(шчучка, верабейкі, салавейка, канарэечкі)* кампаненты ў некаторых канструкцыях дзякуючы наяўнасці суфіксаў *–ачк-*, *-к-* надаюць іх асноўным значэнням дадатковае адценне (памяншальна-ласкальнае), адчаго экспрэсіўнасць канструкцый павышаецца. У вобразе розных птушак і рыб (курапаткі, канарэечкі, краснакрылка, шчука) у беларускім фальклоры паўстаюць дзяўчаты-нявесты ці дзяўчаты, з якімі сябравала нявеста *(А любіць ён, любіць Рыбку-краснакрылку, дзевачку-чорнабрыўку; Ту табе, шэра зязюля, застацца, З намі, пташкамі-курапаткамі, расстацца).* Салавей жа ў фальклоры паказаны не толькі як пеўчая птушка, але і як птушка, якая можа дапамагчы чалавеку *(Салавейка-пташачка, Паляці да наперад нас, Да давай цесцю знаці: Едзе зяць ваяваці, Сабе дзеваньку браці).*

Разгледжаныя намі спалучэнні слоў можна адносіць да сінанімічных канструкцый, зыходзячы з таго, што ў нейкі момант яны маюць пункты сутыкнення. У канструкцыі *ягады-суніцы* значэнне слова *суніцы* ’духмяныя салодкія ці кісла-салодкія ягады раслін суніц’ не поўнасцю паглынаецца значэннем слова *ягады* ’невялікія сакавітыя плады кустовых і травяністых раслін’. Кампанент *суніцы* нясе тую канкрэтыку, якой пазбаўленае слова *ягады,* так як у канструкцыі яно з’яўляецца больш агульным словам. З аднаго боку, род выходзіць за межы віду, а з другога – і сам род не поўнасцю ўключае від. У прыведзенай намі канструкцыі важныя не ўсе канкрэтныя асаблівасці слова *суніцы,* а ўсё тое агульнае, што ўключаецца ў слова *ягады* наогул.

Канструкцыі, утвораныя спалучэннем двух назоўнікаў, складаюцца з кампанентаў, кожны з якіх па сваёй будове і граматычнай форме суадносіцца з асобным словам. У сказе кампаненты такіх канструкцый выступаюць у функцыі аднаго члена сказа. Як адну з характэрных уласцівасцяў такіх канструкцый

неабходна адзначыць цэласнасць іх семантыкі, якая вызначаецца рознай ступенню злітнасці асобных слоў-кампанентаў і знаходзіцца ў залежнасці ад сэнсу ўсёй канструкцыі і значэння кожнага кампанента. Можна вылучыць свабодныя спалучэнні слоў *(лес-бор, ягадка-суніца, клён-дзерава)*; спалучэнні, у якіх абодва кампаненты цалкам страцілі свае асноўныя значэнні, а канструкцыя ў цэлым набыла новае значэнне *(кветачка-рожа ’маладая, нявеста’, пташкі-курапаткі ’сяброўкі нявесты’).* Падобнага тыпу канструкцыі можна лічыць своеасаблівымі фразеалагічнымі адзінкамі.

Спалучэнні слоў, кампаненты якіх суадносяцца як род і від, нешматлікія ў беларускім фальклоры. Часцей за ўсё ў мове вуснапаэтычнай творчасці выкарыстоўваецца толькі відавое паняцце, а слова, якое абазначае радавое паняцце, апушчана. Канструкцыі з рода-відавымі адносінамі паміж словамі-кампанентамі ўяўляюць сабой яркі сродак зрабіць мову фальклору выразнай, вобразнай, маляўнічай.